УДК 391– 055.1 (=161.3)

# ДАСЛЕДАВАННЕ ТРАДЫЦЫЙНАГА МУЖЧЫНСКАГА КАСЦЮМА БЕЛАРУСАЎ АЙЧЫННЫМІ НАВУКОЎЦАМІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XX – ПАЧАТКУ XXI СТСТ.

***І.Г. БАЧЫЛА***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Уводзіны.** Гісторыя вывучэння айчыннымі навукоўцамі другой паловы XX – пачатку XXI ст. мужчынскага касцюма яшчэ не была прадметам спецыяльнага даследавання. Каштоўны і багацейшы матэрыял, сабраны за гэты час і размешчаны ў спецыяльных выданнях, патрабуе дасканалага аналізу. Мэта артыкула – прааналізаваць ступень даследаванасці дадзенай часткі традыцыйнай матэрыяльнай культуры беларусаў у другой палове XX – пачатку XXI стст. Даследаванне скіравана на атрыманне навейшых навуковых вынікаў. Іх увядзенне ў навуковы зварот будзе спрыяць вырашэнню тэарэтычных праблем, практычных задач.

**Асноўная частка.** Мэтанакіраваным і сістэматычным вывучэннем касцюма беларусаў айчынныя навукоўцы пачалі займацца ў 1950 – 1970–х гг. Гэтаму спрыяла стварэнне ў Акадэміі навук БССР ў 1957 г. Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору.

Першай этнаграфічнай работай другой паловы XX ст., у якой звернута ўвага на традыцыйны мужчынскі касцюм беларусаў XIX – пачатку XX стст., была манаграфія Л.А. Малчанавай «Матэрыяльная культура беларусаў» (1968). Даследчыца паказала разнастайнасць рэгіянальных назваў, асаблівасці крою, тэхнікі пашыву кашуль, безрукавак і верхняга адзення. Яна ахарактарызавала плеценыя паясы, іх рэгіянальныя асаблівасці і выкарыстанне ў абрадавых дзеяннях, галаўныя ўборы, вызначыла іх тыпы, адзначыла рэгіянальныя варыянты назваў лапцей, асаблівасці нарыхтоўкі матэрыялаў для іх вырабу, некаторыя спосабы пляцення. Л.А. Малчанава звярнула ўвагу на асаблівасці выкарыстання разнастайных упрыгожванняў у мужчынскім касцюме, а таксама на ўзаемасувязь і ўзаемаўплыў мужчынскіх касцюмаў усходнеславянскіх этнасаў. Яна адзначыла, што сарочкі–касавароткі з'явіліся на Беларусі ў мясцовасцях, памежных з Расіяй, а тканыя беларускія паясы падобныя да літоўскіх па тэхніцы вырабу, характару арнамента і ролі ў паўсядзённым жыцці [1, с. 160].

У 1965 г. сектар этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР сумесна з адпаведнымі структурамі Акадэмій навук Украінскай і Малдаўскай ССР распачаў працу па стварэнню рэгіянальнага гістарычна–этнаграфічнага атласа. Сабраныя матэрыялы сталі асновай калектыўнай працы «Беларускае народнае адзенне» (1975). У даследаванні ахарактарызаваны віды традыцыйнага беларускага сялянскага касцюма XIX – пачатку XX стст., паказаны яго лакальныя асаблівасці. Аўтары вылучылі некалькі тыпаў мужчынскіх сарочак адпаведна крою, форме каўняра, спосабу нашэння, вызначылі тэрыторыю іх распаўсюджання. Была ахарактарызавана безрукаўка мужчынскага касцюма і асаблівасці матэрыялаў, якія выкарыстоўваліся для яе пашыву. Навукоўцамі былі разгледжаны некалькі тыпаў верхняга адзення, рэгіянальныя і лакальныя варыянты назвы світы.

Даследчыкі ахарактарызавалі тры тыпы мужчынскіх галаўных убораў у адпаведнасці са спосабамі іх вырабу, паказалі арэалы распаўсюджання шапак [2, с. 56], узаемасувязь галаўных убораў і прычосак, разгледзелі тэхніку пляцення лапцей, рэгіянальныя варыянты іх назваў, арэалы распаўсюджання лапцей касога пляцення.

У 1970 – пачатку 1980–х гг. Л.А. Малчанава працягвала вывучэнне асаблівасцей касцюма беларусаў. Вынікі працы знайшлі сваё адлюстраванне ў кнізе «Очерки материальной культуры белорусов XVI – XVIII вв.» (1981). У ёй даследчыца разгледзела асаблівасці шляхецкага і сялянскага касцюмаў XVI – XVIII стст., параўнала іх.

У 1981 г. Г.М. Курыловіч апублікавала працу «Белорусское народное ткачество». Даследчыца звярнула ўвагу на тканіны, якія выкарыстоўваліся для пашыву асобных элементаў мужчынскага касцюма ў сярэдзіне XIX ст. – 1980–х гг., падрабязна ахарактарызавала асаблівасці колеру мужчынскіх сарочак.

У 70 – 80–х гг. XX ст. традыцыйны касцюм вывучалі таксама мастацтвазнаўцы М.Ф. Раманюк і Я.М. Сахута. У 1967 – 1975 гг. М.Ф. Раманюк правёў шэраг палявых экспедыцый па Беларускаму

Полесгу

Палессю, сістэматызаваў узоры традыцыйнага сялянскага касцюма гэтага рагіёна ў канцы XIX – пачатку XX ст., выявіў яго канструктыўныя, кампазіцыйныя і дэкаратыўныя асаблівасці, паказаў сувязь палескага касцюма з касцюмамі рускіх, украінцаў, палякаў, літоўцаў. У заходнепалескім і ўсходнепалескім святочным касцюме М.Ф. Раманюк вылучыў лакальныя варыянты, адзначыў падабенства некаторых элементаў касцюма Усходняга Палесся, Цэнтральнай Беларусі, Падняпроўя.

У працах «Народны касцюм Беларускага Палесся» (1975), «Беларускае народнае адзенне» (1981), «Народны касцюм Чачэрска і ваколіц (канец XIX – пачатак XX ст.)» (1993) М.Ф. Раманюк выклаў вынікі даследавання рэгіянальных тыпаў традыцыйнага беларускага касцюма, разгледзеў разнастайныя віды і формы сялянскага касцюма, спосабы і прыёмы яго крою, пашыву, каларыстычнага рашэння, мастацка–дэкаратыўнай апрацоўкі і арнаментыкі, асаблівасці нашэння. Ён вылучыў характэрныя рысы строяў розных рэгіёнаў Беларусі – Усходняга і Заходняга Палесся, Падняпроўя, Цэнтральнай Беларусі, Панямоння і Падзвіння, адзначыў асаблівасці традыцыйнага касцюма розных этнаграфічных раёнаў у гэтых рэгіёнах.

У 1980–ыя гг. было здзейснена параўнальнае вывучэнне традыцыйнага касцюма Беларускага і Украінскага Палесся, апублікавана праца «Палессе. Матэрыяльная культура» (1988). Раздзел, прысвечаны традыцыйнаму беларускаму касцюму, напісала Л.А. Малчанава. Яна ахарактарызавала асноўныя кампаненты палескага мужчынскага касцюма.

Багаты матэрыял па традыцыйнаму мужчынскаму касцюму беларусаў змешчаны ў энцыклапедыі «Этнаграфія Беларусі» (1989). М.Ф. Раманюк і В.С. Вайткевіч у арыткуле «Адзенне» ахарактарызавалі функцыі касцюма, асноўныя напрамкі яго эвалюцыі, параўналі касцюм сялян і прывілеяваных саслоўяў, адметнасці святочнага і паўсядзённага касцюма, прааналізавалі крой і дэкор асобных элементаў строю [3, с. 21].

Асаблівасці абрадавага касцюма беларусаў, яго функцыі, сімвалічнае значэнне разгледзела В.Я. Фадзеева. Падрабязна ахарактарызавала паясы, іх лакальныя варыянты, прааналізавала разнастайныя спосабы іх вырабу і ўпрыгожвання В.І. Селівончык. Эвалюцыю мужчынскіх прычосак ад старажытнасці да пачатку XX ст. прасачыла Л.У. Дамнянкова. Яна параўнала прычоскі сялян і шляхціцаў.

У 1990–х гг. працягвалася даследаванне беларускага традыцыйнага касцюма, яго асобных частак і аздаблення (В.Я. Фадзеева, М.М. Віннікава), рэгіянальных (Л.У. Дучыц, Л.І. Маленка) і лакальна–тыпалагічных (В.С. Цітоў) асаблівасцей.

У працы В.Я. Фадзеевай «Беларуская народная вышыўка» (1991) на падставе шматлікіх літаратурных і музейных крыніц, багатага фактычнага матэрыялу, сабранага аўтарам у розных рэгіёнах Беларусі з 1979 па 1986 гг., былі ахарактарызаваны матэрыялы, тэхніка выканання, арнамент, функцыянальнае прызначэнне вышываных прадметаў. Даследчыца картаграфавала арнаментыку, параўнала арнаментальныя комплексы традыцыйнай вышыўкі Беларускага і Украінскага Палесся.

Багаты матэрыял аб асобных элементах мужчынскага касцюма Заходняга і Усходняга Палесся быў сабраны М.М. Віннікавай. У працы «Скарбы з вясковых куфраў: Традыцыйны касцюм і тэкстыль з калекцыі «Народнае мастацтва Беларускага Палесся»: ілюстраваны каталог» (2009) даследчыца вывучыла тэхніку вырабу, канструктыўныя асаблівасці, адзначыла разнастайныя назвы сарочкі, пояса.

Л.І. Маленка прасачыла эвалюцыю традыцыйнага беларускага касцюма ад старажытнасці да XX ст., разгледзела рэгіянальныя асаблівасці беларускага касцюма. Больш падрабязна яна ахарактарызавала адметнасці заходнепалескага касцюма 1920 – 1930–х гг.

В.С. Цітоў вызначыў асноўныя рысы мужчынскага касцюма, ахарактарызаваў разнастайныя варыянты крою кашулі, спосабы яе нашэння ў шляхецкім і сялянскім асяроддзі [4, с. 232]. Асобную ўвагу ён звярнуў на мужчынскія і жаночыя галаўныя ўборы, параўнаў іх, сцісла раскрыў адметнасці абутку.

У пачатку XXI ст. значна павялічылася колькасць даследаванняў, прысвечаных галаўным уборам і паясам мужчынскага касцюма. А.М. Раманюк паказала сувязь галаўных убораў з прычоскай [5, с. 101]. Яна звярнула ўвагу на матэрыялы, з якіх выраблялі галаўныя ўборы, а таксама асаблівасці іх аздаблення, падкрэсліла, што для этнаграфічных рэгіёнаў былі ўласцівыя пэўныя віды галаўных убораў, спосабы нашэння, своеасаблівая тэхналогія вырабу.

Асаблівасці беларускіх паясоў даследуе П. Богдан. Яна вызначыла адметнасці паясоў розных гістарычна–этнаграфічных рэгіёнаў, звярнула ўвагу на іх аздабленне, ахарактарызавала асаблівасці афармлення канцоў пояса, колеравае рашэнне, тэхніку вырабу, параўнала аздабленне мужчынскіх і жаночых паясоў. Найбольш грунтоўна П. Богдан прааналізавала асаблівасці паясоў Паазер’я і Панямоння.



ПолесГУ

У пачатку XXI ст. В.М. Бялявінай і Л.В. Ракавай было праведзена комплекснае даследаванне мужчынскага касцюма Беларусі, апублікавана кніга «Мужчынскі касцюм на Беларусі» (2007). В.М. Бялявіна параўнала структуру і функцыі касцюма сялян і прывілеяваных саслоўяў, прасачыла эвалюцыю мужчынскага касцюма, адзначыла, што з другой паловы XIX ст. у касцюме сялян тунікападобная кашуля стала выцясняцца кашуляй з палікамі, разгледзела эвалюцыю мужчынскага абутку, варыянты рэгіянальных назваў яго асобных відаў, выкарыстанне аксесуараў [6, с. 237].

Л.В. Ракава параўнала верхняе адзенне шляхты і сялян, ахарактарызавала розныя тыпы верхняга адзення сялян, яго рэгінальныя асаблівасці [6, с. 174], звярнула ўвагу на функцыі галаўных убораў, вызначыла фактары, якія ўплывалі на іх крой, паказала асаблівасці мужчынскіх прычосак.

Назвы частак традыцыйнага беларускага касцюма вывучалі А.С. Сакалоўская, А.А. Акуленка, Т.М. Казачэнка, А.А. Станкевіч, В.У. Кліменка. Яны разгледжаны ў калектыўных працах «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы» (1963) і «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак» (1993 – 1998). У пачатку XXI ст. Н.В. Сівіцкая даследавала назвы касцюма і яго частак у сучасных гаворках беларускай мовы, адзначыла рэгіянальныя і лакальныя варыянты назваў доўгага і кароткага верхняга адзення з даматканага сукна і аўчыны, вызначыла арэалы распаўсюджання назваў адзенне, адзежа, вопратка, убранне, плацце, крамніна.

Мастацкія асаблівасці беларускага мужчынскага касцюма вывучала В.А. Лабачэўская. У працы «Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы» (2009) яна змястоўна прааналізавала асаблівасці аздаблення мужчынскіх сарочак вышыўкай, кампазіцыйныя варыянты яе размяшчэння, матэрыялы вышыўкі, змясціла вялікую колькасць схем па тэхналогіі вышыўкі і арнаменту.

А.Г. Васільева сабрала і прааналізавала матэрыялы аб асаблівасцях мужчынскага касцюма XIX – пачатку XX стст. паўночнага захада Беларусі, вызначыла яго лакальныя рысы, падрабязна ахарактарызавала касцюм Лідскага краю.

І.Ю. Смірнова разгледзела мужчынскі касцюм Гродзеншчыны, прасачыла яго эвалюцыю ў другой палове XIX – канцы XX стст., адзначыла змены яго частак, асабліва кашулі, нагавіц, галаўных убораў.

Рэгіянальныя і лакальныя рысы мужчынскага касцюма асветлены ў шасцітомнай працы «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (2001 – 2013), у падрыхтоўцы якой ўдзельнічалі М.Ф. Раманюк, М.М. Віннікава, І.Ю. Смірнова, В.А. Лабачэўская, Н.А. Бабровіч. У ёй ахарактарызаваны мужчынскі касцюм усіх рэгіёнаў Беларусі – Падзвіння, Падняпроўя, Панямоння, Цэнтральнай Беларусі, Усходняга і Заходняга Палесся.

**Заключэнне.** Такім чынам, беларускімі навукоўцамі дасягнуты значныя поспехі ў даследаванні мужчынскага касцюма. Найбольш поўна вывучаны сялянскі мужчынскі касцюм канца XIX – пачатку XX ст.: выяўлены яго асноўныя тыпы і падтыпы, вызначаны рэгіянальныя і лакальныя варыянты, акрэслена тэрыторыя іх распаўсюджання, разгледжаны дыялектная тэрміналогія, матэрыялы, каларыстычнае рашэнне і дэкаратыўныя прыёмы яго аздаблення, асаблівасці нашэння. Мала даследаванымі застаюцца тэарэтычныя аспекты пытання. Тэрміналагічны апарат таксама патрабуе ўдакладнення і ўвядзення новых паняццяў.

## ЛІТАРАТУРА

1. Молчанова, Л.А. Материальная культура белорусов / Л.А. Молчанова. – Минск : Наука и техника, 1968. – 230 с.

2. Беларускае народнае адзенне / Акадэмія навук БССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. В.К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 94 с.

3. Раманюк, М.Ф. Адзенне / М.Ф. Раманюк, В.С. Вайткевіч // Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / Беларуская Савецкая Энцыклапедыя ; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – С. 21–24.

4. Цітоў, В.С. Народная спадчына : Матэрыяльная культура ў лакальна–тыпалагічнай разнастайнасці / В.С. Цітоў ; навук. рэд. Г.В.Штыхаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.

5. Раманюк, А.М. Асаблівасці вывучэння галаўных убораў у комплексе традыцыйных беларускіх строяў канца XIX – пачатку XX ст. / А.М. Раманюк // Актуальные проблемы мировой художественной культуры : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. памяти проф. У.Д. Розенфельда, Гродно, 8–9 апр. 2008 г. : в 2 ч. / ГрГУ имени Я. Купалы ; редкол.: А.П. Богустов (отв. ред.) и [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2008. – 227 с. – Ч. 2. – С. 99–102.

6. Бялявіна, В.М. Мужчынскі касцюм на Беларусі / В.М. Бялявіна, Л.В. Ракава. – Мінск : Беларусь, 2007. – 302 с.



Полесгу

## RESEARCH OF A TRADITIONAL BELARUSIAN SUIT BY NATIVE SCIENTISTS OF THE SECOND HALF OF THE XX AND THE BEGINNING OF THE XXI CENTURY

***I.G. BACHYLA***

***Summary***

The article is devoted to a present–day issue which is not studied defectively in Belarusian ethnology. Works of native scientists of the second half of the $20^{th}$ and the beginning of the twenty first century were thoroughly analysed by the author. A traditional suit was studied in these works. A degree of study of this topic and questions which have not been studied yet were traced.

© Бачыла І.Г.

*Поступила в редакцию 19 марта 2014г.*

ПолесГУ